20 год Гродзенскай дыяцэзіі (43)

Аўтар: Рэдакцыя
07.02.2013 01:00



2012 год

9 чэрвеня - У францішканскім касцёле адбыліся святарскія і дыяканскія пасвя-чэнні айцоў францішканаў. Кс. бп Аляксандр удзяліў пасвя-чэнні дк. Андрэю Ахрэму і Каралю Бараноўскаму.

23 чэрвеня - У Лідзе ў пар. Божай Міла-сэрнасці адбылася II Дыя-цэзіяльная сустрэча настаўнікаў і выхавацеляў.

26 – 27 чэрвеня - У Гродне адбыліся Вечары хрысціянскіх фільмаў.† 26 – 27 чэрвеня - У Пераломе адзначалася 15-годдзе ўзнікнення віцэ-правінцыі капуцынаў у Беларусі.

29 чэрвеня – 1 ліпеня - У Росі а. Джэймс Манджакал правёў рэкалекцыі, у якіх прынялі ўдзел 4 тысячы вернікаў.

24 – 26 жніўня - У Гродне адбыўся I Кангрэс каталіцкіх СМІ ў Беларусі.

22 верасня - Адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя 100-годдзю касцёла ў Вялікай Бераставіцы. Урачыстасці ўзначаліў кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч.

21 кастрычніка - У Міжэрычах адзначалася 100-годдзе святыні. Урачыстасці ўзначаліў пастар дыяцэзіі.

22 кастрычніка - У Тракелях адбыліся ўра-чыстасці ўнясення рэліквій бл. Яна Паўла II. Рэліквіі ўнёс Апостальскі нунцый у Беларусі.

22 кастрычніка - У Іўі кс. бп Аляксандр Кашкевіч і кс. бп Антоній Дзям'янка ў прысутнасці сабраных вернікаў асвяцілі фігуру Яна Паўла II, якая была змешчана на Помніку чатырох культур і рэлігій.